Дзяржаўная ўстанова адукацыі
« Барсукоўская сярэдняя школа»

# ДЫФЕРЭНЦЫРАВАНЫ ПАДЫХОД У НАВУЧАННІ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Падрыхтавала: настаўнік
пачатковых класаў
Мазынская Святлана Міхайлаўна

ag. Барсукі, 2023 г.

## ДЫФЕРЭНЦЫРАВАНЫ ПАДЫХОД У НАВУЧАННІ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Праблема дыферэнцыраванага навучання працягвае заставацца актуальнай і сёння. Што ж такое дыферэнцыраванае навучанне? Пад дыферэнцыраваным навучаннем разумеюць форму арганізацыі вучэбнай дзейнасці для розных груп навучэнцаў. Індывідуальны падыход – важны псіхолага-педагагічны прынцып, які ўлічвае індывідуальныя асаблівасці кожнага дзіцяці. Пагаджуся з вядомым псіхолагам Н.А. Мянчынскай ў тым, што “ эфект навучання залежыць не толькі ад яго зместу і метадаў, але і ад індывідуальных асаблівасцей вучняў” [4, с. 254]. Развіццё мыслення навучэнцаў – адна з асноўных задач. Тое, што навучанне так ці інакш павінна быць ўзгоднена з узроўнем развіцця дзіцяці, - гэта ўсталяваны і правераны факт, які немагчыма аспрэчваць. Розныя вучні па-рознаму авалодваюць ведамі, уменнямі і навыкамі. Гэтыя адрозненні абумоўлены тым, што кожны вучань у сілу спецыфічных для яго ўмоў развіцця, як знешніх, так і ўнутраных, валодае індывідуальнымі асаблівасцямі. Псіхафізіялагічныя асаблівасці навучэнцаў, розныя ўзроўні іх разумовых здольнасцей заканамерна патрабуюць для забеспячэння эфектыўнага навучання кожнага вучня ці групы дзяцей неаднолькавых умоў навучання. Ва ўмовах класна-ўрочнай сістэмы навучання гэта магчыма пры індывідуалізацыі і дыферэнцыяцыі навучання.

Старое дыдактычныя правіла «Вучыць дзяцей вучыцца» ніколі не было так актуальна, як цяпер. Неабходна навучыць вучня самастойна кіраваць сваёй пазнавальнай дзейнасцю. Д. Б. Эльконін падкрэсліваў, што «своеасаблівасць і значэнне вучэбнай дзейнасці школьніка не столькі ў засваенні тых ці іншых ведаў і ўменняў, колькі ў змене дзіцем самога сябе» [1, с. 18]. Навучанне дзяцей, розных не толькі па ўзроўні падрыхтоўкі, але нават па вучэбных магчымасцях, мабыць, самая складаная задача, якая стаіць перад настаўнікам. І вырашыць яе немагчыма без індывідуальнага падыходу да навучання.

Адным са шляхоў рэалізацыі індывідуальнага падыходу да дзяцей з'яўляецца дыферэнцыяцыя навучання. Дыферэнцыраваная арганізацыя вучэбнай дзейнасці на ўроках беларускай мовы з аднаго боку ўлічвае ўзровень разумовага развіцця, псіхалагічныя асаблівасці навучэнцаў. З іншага боку, пад увагу прымаюцца індывідуальныя запыты асобы, яе магчымасці і інтарэсы ў канкрэтнай адукацыйнай вобласці. Пры дыферэнцыраванай арганізацыі вучэбнай дзейнасці гэтыя два бакі перасякаюцца.

Сістэматычнае прымяненне розных формаў дыферэнцыяцыі на ўроках беларускай мовы дае магчымасць навучэнцам адчуваць сябе камфортна на ўроку,развівацца, павысіць цікавасць да вучэння, дазваляе справіцца з рашэннем вучэбных задач ўсім навучэнцам.

Адзін з шляхоў рэалізацыі індывідуальнага падыходу да дзяцей і паспяховага засваення імі праграмнага матэрыялу — дыферэнцыяцыя навучання. Таму навучанне павінна быць, па выразе Ш. А. Амонашвілі, «варыятыўным згодна з індывідуальнымі асаблівасцямі школьнікаў». Тэрмін дыферэнцыяцыя (ад лац. differentia — адрозненне) азначае расчляненне, падзел цэлага на розныя формы і прыступкі [4, с. 15]. Дыферэнцыраваным лічыцца вучэбна-выхаваўчы працэс, для якога характэрны ўлік тыповых індывідуальных асаблівасцей навучэнцаў.

Як будаваць працэс дыферэнцыраванага навучання? Практыкі кажуць: па ступені разумовага развіцця, працаздольнасці. Тэарэтыкі лічаць: па ступені дапамогі вучню. Дыферэнцыяцыю можна праводзіць па ступені самастойнасці вучняў пры выкананні вучэбных дзеянняў.

Для сябе я разбіла гэтую работу на некалькі этапаў:

1. Вывучэнне індывідуальных асаблівасцей вучняў – фізічных (здароўя), псіхалагічных, асобасных, у тым ліку асаблівасцей разумовай дзейнасці, і нават ўмоў жыцця ў сям'і.

У сувязі з гэтым успамінаюцца словы К. Д. Ушынскага: «Калі педагогіка хоча выхоўваць чалавека ва ўсіх адносінах, то яна павінна перш за ўсе пазнаць яго таксама ва ўсіх адносінах». Для гэтага я выкарыстоўваю асабістыя назіранні, анкетаванне, гутаркі з бацькамі, а таксама абапіраюся на вынікі абследаванняў, якія праводзяцца нашымі педагогамі-псіхолагамі і сацыяльнымі педагогамі.

2. Выдзяленне асобных груп навучэнцаў, якія адрозніваюцца:

– розным узроўнем засваення матэрыялу на дадзены момант;

– узроўнем працаздольнасці і тэмпам працы;

– асаблівасцямі ўспрымання, памяці, мыслення;

3. Складанне або падбор дыферэнцыраваных заданняў, што ўключаюць розныя прыёмы, якія дапамагаюць навучэнцам самастойна справіцца з заданнем, або звязаных з павелічэннем аб'ёму і складанасці задання.

4. Пастаянны кантроль за вынікамі работы вучняў, у адпаведнасці з якімі змяняецца характар дыферэнцыраваных заданняў.

Кожны з гэтых этапаў па-свойму складаны. У кожнага настаўніка свой падыход да выдзялення груп навучэнцаў. З майго пункту гледжання, больш правільна будзе не дзяліць дзяцей на «слабых» і «моцных», а аднесці іх да трох ўмоўных груп. Гэтыя групы не сталыя, іх склад можа мяняцца.

1 група – дзеці, якія патрабуюць пастаяннай дадатковай дапамогі.

2 група – дзеці, здольныя справіцца самастойна.

3 група – дзеці, здольныя спраўляцца з матэрыялам за кароткі тэрмін з высокім якасцю і аказваць дапамогу іншым.

Дзеці 1 групы адрозніваюцца нізкай і няўстойлівай працаздольнасцю, павышанай стамляльнасцю, цяжкасцямі ў арганізацыі ўласнай дзейнасці,

нізкім узроўнем развіцця памяці, увагі, мыслення. Ім неабходна пастаянная стымуляцыя, яркая матывацыя, дакладнае адсочванне часовага рэжыму, праверка якасці выканання заданняў, уключэнне заданняў на развіццё. Гэтым навучэнцам педагогі звычайна надаюць максімум увагі.

Дзеці 2 групы больш за ўсё падабаюцца настаўніку, з імі мала клопатаў. У іх добрая памяць і ўвага, нармальна развіта мысленне, правільная гаворка, іх адрозніваюць стараннасць, добрасумленнасць, высокая вучэбная матывацыя. Ім не трэба пастаянная надакучлівая ўвага настаўніка, дастаткова невялікай стымуляцыі, уключэнне творчых заданняў.

Дзеці 3 групы валодаюць «акадэмічнай адоранасцю», якая прадстаўляе сабой адзінства пазнавальнай цікаўнасці, эмацыянальнай уключанасці, матывацыі і здольнасці да рэгуляцыі сваіх дзеянняў.

Дыферэнцыраванае навучанне дае магчымасць для стварэння аптымальных умоў для паспяховага засваення ўсімі навучэнцамі праграмнага матэрыялу, дапамагае стварыць спрыяльную абстаноўку для дзяцей з рознымі ўзроўнямі навучання, так як ажыццяўляецца індывідуальны падыход да навучання кожнага дзіцяці і ствараюцца ўмовы для таго, каб кожны вучань мог цалкам рэалізаваць сябе, хацеў і ўмеў вучыцца.

## Спіс літаратурных крыніц

1. Алфёрова Е.И. Изучение индивидуальных особенностей личности школьников/ Е.И.Алферова. – Тобольск, 2004. – 265 с.
2. Анолупо Н.Н. Дифференцированный подход к учащимся в процессе обучения/ Н.Н.Анолупо// Начальная школа. - 2003. - №3.
3. Кларин М. В. Педагогическая технология в учебном процессе. Анализ зарубежного опыта. – М.: Знание, 1989.- 80 с.
4. Менчинская Н. А. Проблемы учения и развития // Проблемы общей, возрастной и педагогической психологии. М. 1978.- 254 с.
5. Осмоловская И. М. Организация дифференцированного обучения в современной общеобразовательной школе/ И. М. Осмоловская. - М.: Изд-во Институт практической психологии; Воронеж: НПО “Модэк”, 1998. – 265 с.
6. Унт И. Э. Индивидуализация и дифференциация обучения / И.Э.Унт //Педагогика. - 1990. - №7.
7. Штейнберг В. Э. Дидактические многомерные инструменты: Теория, методика, практика. М.: Народное образование, 2002. - 304 с.